№1(47)/2002-2003

# Беларускія Ведамасьці

ВАРШАВА, сьнежань 2002 г.- студзень 2003 г.

# ТРЭБА ЗЬБЕРАГЧЫ МОЛАДЗЬ



Фота В. Зянько

## ХРОНІКА ПАРУШЭНЬНЯЎ ПРАВОЎ БЕЛАРУСАЎ

### *САКАВІК* *(2002 г., працяг з №6(46)*

*4 сакавіка ў Віцебску* быў асуджаны сп. ***Уладзімер Плешчанка***, сябра *Сойму Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі – БНФ* і *Беларускага Народнага Фронту „Адраджэньне”*. Суддзя Чыгуначнага раённага суду **С**. **Туфан** прысудзіла яму штраф у 2 мільёны рублёў (каля 1200 даляраў ЗША), прызнаўшы яго вінаватым у „арганізацыі несанкцыянаванага пікетаваньня”. 22 студзеня сп. Плешчанка выйшаў у цэнтр Віцебска з плякатам *„**Патрабуем новых пазачарговых прэзыдэнцкіх выбараў пад міжнародным пратэктаратам**”*. Летась за ўдзел у мірных акцыях пратэсту сп. Плешчанка быў аштрафаваны неаднаразова, што склала ў суме штрафы на 450 мінімальных заробкаў. Дыктатарскі антыбеларускі рэжым не раз заяўляў у апошні час праз свае пралукашэнкаўскія арганізацыі (Беларускі фонд міру і г.д.) пра неабходнасьць „пакаяньня і згоды ў нашым грамадзтве”. Дзікія прысуды грамадзянам, якія мірна выказваюць сваю думку, сьведчаць пра цану хлусьлівых заклікаў да згоды з боку рэжыму.

*6 сакавіка ў Магілёве* кіроўцы машын „хуткай дапамогі” правялі страйк супраць нявыплатаў заробкаў за студзень. Чатыры пятыя кіроўцаў не працавалі, апрача медгрупы экстранай дапамогі.

*6 сакавіка ў Віцебску* судовыя выканаўцы апісалі маёмасьць *у кватэры бацькоў **Паўла Севярынца***. Справа ў тым, што суд наклаў на Паўла штраф (300 мінімальных заробкаў) за ўдзел у дэманстрацыі 14 лютага сёлета.

*Сакавік.* Былы кіраўнік Беларускай дзяржавы (Старшыня Вярхоўнага Савету 12-га скліканьня) ***Станіслаў Шушкевіч*** падаў зыск у суд з патрабаваньнем праіндэксаваць прызначаную яму ў 1996 годзе пэнсію. Суд Маскоўскага раёну Менска адмовіў у задавальненьні скаргі С.

Шушкевіча, бо асобны парадак прызначэньня альбо пераразьліку пэнсіі былым старшыням Вярхоўнага Савету не прыняты.

*11 сакавіка* Горадзенскі выканкам забараніў грамадзкасьці Горадні правядзеньне трох пікетаў у абарону галоўнага рэдактара *„Пагоні"* ***Міколы Маркевіча*** і журналіста ***Паўла Мажэйкі***, якіх пракуратура вобласьці абвінавачвае ў „паклёпе на прэзыдэнта".

*13 сакавіка. Менск.* Завяршыўся судовы працэс па адміністрацыйнай справе сп. ***Уладзімера Плотнікава***, сябра *Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі – БНФ*. У студзені сёлета *спадару Плотнікаву* ўжо прысудзілі штраф у памеры 150 мінімальных заробкаў за тое, што ён летась, 9 лістапада, удзельнічаў у абароне Курапатаў. Прысуд абаронцу Курапатаў („за арганізацыю несанкцыянаванага пікетаваньня ў Курапатах") быў вынесены завочна. Таму Абласны суд адмяніў судовае рашэньне як незаконнае, ўдалося дамагчыся перагляду справы ў тым жа судзе Менскага раёну (г. Заслаўе) ў новым складзе суда.

Падчас суду сакратарка прызналася, што ня ведае беларускай мовы. Суддзя вымушаны быў абвясьціць перапынак, каб замяніць яе на іншую. Праз паўгадзіны высьветлілася, што ніхто з сакратароў Менскага раённага суду не валодае дзяржаўнай мовай. Працэс прадоўжыўся ў ранейшым складзе.

„Я ў Курапатах усталяваў тры крыжы. На адным я прымацаваў шыльдачку і запісаў прозьвішчы маіх дзядзькоў – ***Мікалай Мурашка, Уладзімер Мурашка, Віктар Мурашка***. У 1937 годзе іх забілі. З таго часу мы ня ведаем, дзе яны. Я рашыў усталяваць тут тры крыжы, каб прыходзіць сюды, як на магілкі.

Гэтыя крыжы зьнішчаныя. Варвараў не ўстрымала тое, што яны асьвечаны сьвятаром", — паведаміў У. Плотнікаў.

Супрацоўнікі міліцыі, якія (як заўсёды ў такіх справах) іграюць ролю сьведкаў, не змаглі прадставіць сьведчаньняў супрацьпраўных дзеяньняў спадара Плотнікава.

Суддзя **Дзьмітры Грыцэль** заслухаў „сьведкаў", прагледзеў відэастужку і – прызнаў Уладзімера Плотнікава правапарушальнікам, прысудзіўшы яму той жа штраф — 150 мінімальных заробкаў.

„Прысуд супярэчыць ня толькі Кодэксу аб Адміністрацыйных правапарушэньнях, але і Канстытуцыі Беларусі. У нас ёсьць тэрмін разгляду адміністрацыйных справаў у судах. На падставе арт. 227 гэтая справа павінна быць спыненая, таму што не была разгледжаная ў тэрмін. Заканадаўства было цынічна парушана.

Суддзя спасылаецца на нейкую пастанову Пленуму Вярхоўнага Суда. Калі я папрасіла паказаць гэтую пастанову (як юрысту), ён ня змог гэтага зрабіць, — сказала адвакат ***Вера Страмкоўская***. — Ніхто яшчэ не адмяняў Кодэкс аб Адміністрацыйных правапарушэньнях. Суддзі ня могуць перавышаць Канстытуцыю і нашы законы."

Так скончылася судовая расправа над грамадзянінам, які ставіў у Курапатах крыжы, ствараючы Народны Мэмарыял, і бараніў сьвятыню.

*15 сакавіка ў Маладэчне* былі затрыманыя два сябры Маладога Фронту ***Максім Гурскі*** і ***Алесь Рыдзеўскі***, якія раздавалі праваабарончыя выданьні на вуліцах гораду.

*15 сакавіка ў Віцебску* за распаўсюджаньне партыйнай літаратуры затрыманы сябра Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі – БНФ ***Уладзімер Плешчанка***.

*15 сакавіка ў Шклове* за „абразу прэзыдэнта" непаўнагадовыя ***Максім Патупчык*** і ***Алесь Паўловіч*** аштрафаваныя на 20 мінімальных заробкаў; ***Міхаіл Кісялёў, Дзяніс Сенакосаў***, ***Зьміцер Шалашкоў*** – на 100. (Мінімальны заробак – 17 тысячаў рублёў.)

*15 сакавіка. Менск.* Старшыня Вярхоўнага Савета 12-га скліканьня ***Мечыслаў Грыб*** выказаўся ў эфіры радыё „Свабода" пра дэкрэты Лукашэнкі наступным чынам: „А што тычыцца паўнапраўнасьці гэтых дэкрэтаў, яны (гэтыя дадаткі да Канстытуцыі) сёньня зьяўляюцца незаконнымі. ***Рэфэрэндум праводзіўся (па зьменах у Канстытуцыю) дарадчага характару. Гэта значыць, што потым яны павінны былі быць разгледжаны на паседжаньні Вярхоўнага Савета і прыняты Вярхоўным Саветам. Да гэтага ж справа не дайшла. Вярхоўны Савет незаконна разагналі і незаконна зацьвердзілі гэтыя дапаўненьні ў Канстытуцыю***.

Таму я ня бачу неабходнасьці нешта сцьвярджаць, што нейкі дэкрэт стаў станоўчым у нашым жыцьці. Гэтыя дэкрэты незаконныя. Яны ня маюць права на існаваньне, у тым ліку і той „канстытуцыйны суд", які меў магчымасьць стварыць паважаны Аляксандар Лукашэнка.

Які ж гэта „канстытуцыйны суд", які ня мае ніякіх правоў? Які нават па сваёй волі ня можа прыняць да разгляду тое ці іншае пытаньне.

Няма сёньня ні Канстытуцыі, ні Канстытуцыйнага Суду, нічога няма. Ёсьць „бязьмежжа". І дэкрэты выдаюцца сёньня з грубейшымі парушэньнямі Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, нават гэтай канстытуцыі 1996 года."

*20 сакавіка* з трэцяга курсу Магілёўскага палітэхнічнага тэхнікуму адлічаныя ***Аляксандар Каліта*** і ***Алесь Паўловіч***. (Падчас леташняй прэзыдэнцкай кампаніі юнакі хадзілі па Шклову ў вусатых масках і абяцалі „навесьці парадак" і павялічыць заробак. 14 сакавіка суд Шклоўскага раёну прызнаў іх вінаватымі па крымінальнай справе аб „публічнай абразе Прэзыдэнта Рэспублікі Беларусь" і пакараў іх буйнымі штрафамі.)

*21 сакавіка* Кастрычніцкі суд Горадні прызначыў прымусовую канфіскацыю маёмасьці ***Міколы Маркевіча*** — галоўнага рэдактара *„Пагоні"*. Суддзя **Жук** матывавала гэта тым, што тэрмін уплаты штрафу (500 тысячаў рублёў) за ўдзел у несанкцыянаваным пікеце скончыўся.

*Сакавік*. Зарплата супрацоўнікаў навуковых установаў адны з самых нізкіх у краіне. Заробак доктара навук (з даплатамі за ступень, званьне) – у лепшым выпадку – 80-90 даляраў. Мала дапамагае дадатковая праца. 1,5 гадзіны лекцыі каштуюць 2000 рублёў (крыху болей за даляр). Вынік – імклівае старэньне акадэмічнай школы. Моладзь сядзіць у Акадэміі Навук да моманту абароны дысэртацыі. Потым сыходзіць.

У Інстытуце фізікі, напрыклад, бальшыня супрацоўнікаў пераведзеная на працоўныя дамовы. Паводле слоў супрацоўнікаў, канкрэтны спэцыяліст запатрабоўваецца толькі тады, калі ёсьць мэтавае фінансаваньне. А паводле задумы цяперашняга кіраўніцтва Акадэміі Навук, навука павінна зрабіцца гэткім „самадастатковым арганізмам" і сама сябе забясьпечваць сродкамі.

Але фундамэнтальная навука ня можа прыносіць прыбытак, паколькі працуе на пэрспэктыву (у адрозьненьне ад прыкладной навукі).

Многім беларускім навукоўцам прыходзіцца шукаць альтэрнатыву за мяжой.

*24 сакавіка,* Менск. Міліцыя затрымала сяброў *Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі – БНФ спадароў* ***Эдварда Зайкоўскага*** і ***Віктара Кавешнікава*** за тое, што яны ішлі па праспэкце Францішка Скарыны пад нацыянальным *Бел-Чырвона-Белым сьцягам.* Антыбеларускі рэжым працягвае сваё мізэрнае існаваньне.

*24 сакавіка, Менск*. У Купалаўскім скверы сабраліся сьвяточна апранутыя менчукі з кветкамі, бел-чырвона-белымі стужкамі і сьцяжкамі. Пасьля ўскладаньня кветак песьняру і сьпяваньня гімну, людзі накіраваліся ў бок плошчы Якуба Коласа, але выхад са скверыку ім перагарадзілі амапаўцы. Міліцыянты пачалі хапаць усіх, хто трапляўся пад руку, у тым ліку – выпадковых сьведкаў і журналістаў. Усяго было арыштавана больш за 60 чалавек. Усіх затрыманых даставілі ў РУУС Савецкага і Цэнтральнага раёнаў. Сярод затрыманых: ***Рыгор Кійко***, ***Натальля Кійко***, ***Эдвард Зайкоўскі***, ***Віктар Кавешнікаў***, ***Дзімітры Карпенка***, ***Эля Некрашэвіч***, ***Валянціна Ваюшына***, ***Аксана Ахрэмчык***, ***Лявон Ачапоўскі***, ***Аляксей Смольскі***, ***Уладзіслаў Ігнатовіч***, ***Сяргей Гвоздзеў***, ***Міхась Гвоздзеў***, ***Ірына Шэршань***, ***Аркадзь Пярцоўскі***, ***Мікола Лавіцкі***, ***Андрэй Таўстко***, ***Таццяна Яловая***, ***Пётра Кшык***, ***Арцём Ярмоленка***, ***Ганна Сіўчык***, ***Аляксандар Шэвяленка***, ***Сяргей Трыфанаў***, ***Лявон Садоўскі***, ***Зьміцер Дашкевіч***, ***Кірыла Папкоў***, ***Андрэй Таўстыка***, ***Сяргей Бязьдзенежны***, ***Валеры Герасімаў***, ***Уладзіслаў Саўка*** *(13 гадоў)* , ***Зьміцер Саўка***, ***Зьміцер Бандарэнка***, ***Ганна Ягорава***, ***Цімафей Дранчук***, ***Андрэй Ягораў***, ***Юрась Зяньковіч***, ***Андрэй Ляховіч***, ***Вячаслаў Сіўчык***, ***Павел Севярынец***, ***Валеры Шчукін***, ***Яўгенія Пікуль***, ***Юрась Пальчэўскі***, ***Анатоль Прасаловіч***, ***Дзяніс Носаў***, ***Сяржук Лысакоў***, ***Пётра Русаў***, ***Новік***.

***(Рэдакцыя „Б.В."; Прэс-служба Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі – БНФ. Валеры БУЙВАЛ)***



Фота Ю. Беленькага

***Курапаты. Крыжовая алея.***

# ЗНОЎ ЗЬНІШЧАНЫ КРЫЖЫ Ў КУРАПАТАХ

У калядную ноч на 25 сьнежня 2002 г. адбыўся чарговы акт вандалізму ў Курапатах. Як бачна па шматлікіх сьлядах на сьнезе, на тэрыторыю ***Народнага Мэмарыялу*** заехала машына, зь якой выгрузіліся некалькі асобаў з сабакамі. Варвары зьнішчылі і пашкодзілі больш за 20 крыжоў на ***Крыжовай алеі*** і непасрэдна на магілах пакутнікаў. Былі паламаныя таксама крыжы на ***Кальварыйскім пагорку*** мэмарыяла, усталяваныя ў кастрычніку 2001 г. беларусамі Віленшчыны. Шэраг крыжоў паламаныя, вырваныя з зямлі, кінутыя далёка ад месца, дзе яны былі ўсталяваныя людзьмі.

Сябры Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі – БНФ прышлі ў Курапаты. Яны сабралі часткі паламаных крыжоў, паставілі некалькі крыжоў, што былі паваленыя на зямлю. У бліжэйшы час яны будуць рэстаўраваць пашкоджаныя помнікі.

Дзікае варварскае разбурэньне адбываецца на тэрыторыі нацыянальнай сьвятыні ўжо ў каторы раз. Але даўно ўжо злачынства не было такім маштабным. Безумоўна, галоўную віну за вандалізм нясе антыбеларускі рэжым, які пабудаваў сваю дарогу на касьцях ахвяраў расейскага тэрору, і ўсімі сродкамі імкнецца зьнішчыць Народны Мэмарыял.

28 сьнежня сакратар Управы Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі – БНФ спадар ***Алесь Чахольскі*** зьвярнуўся ў РУУС Менскага раёну з заявай на ўзбуджэньне крымінальнай справы па факце акту вандалізма на тэрыторыі Народнага Мэмарыялу ў Курапатах. На тэрыторыю Мэмарыялу выязджала апэратыўна-сьледчая група, якая склала пратакол агляду месца злачынства.

***В. БУЙВАЛ***

# МІЛІЦЭЙСКІ ПЕРАСЬЛЕД У ВОРШЫ

*11 студзеня сябры Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі – БНФ* правялі санкцыянаваны пікет у Воршы. Пікет прайшоў пад лёзунгамі ***„Лукашызм зьнішчае Беларусь“, „Расея, рукі прэч ад Беларусі!“, „Ніякіх выбараў без магчымасьці выбіраць!“*** Акцыя выклікала прыхільную рэакцыю і зразуменьне шматлікіх жыхароў горада. Аднак 13 студзеня міліцыя запатрабавала арганізатараў ***Юры Канышку***, ***Уладзімера Карабанава*** і ***Яўгенію Казлову*** ў Аршанскі ГУУС, дзе ім заявілі, што супраць іх будзе ўзбуджана крымінальная справа па арт 167, ч.1 „за абразу гонару прэзыдэнта“. Галоўным аргумантам міліцэйскіх чыноў быў плякат з характарыстыкай дзейнасьці лукашыскага рэжыму ў Беларусі.

Факт міліцэйскага перасьледу беларускіх патрыётаў у Воршы дэманструе антынародную і антыдэмакратычную сутнасьць прарасейскага рэжыму.

***(Прэс-служба БНФ. В. БУЙВАЛ)***

# ДЫКТАТУРА І САТРАП

Агульнымі рысамі дыктатараў зьяўляюцца: першаснасьць асабістай улады, імкненьне да абсалютызацыі асабістай улады і гатоўнасьць ахвяраваць чужымі жыцьцямі дзеля яе ўтрыманьня. Сталін уяўляў сабой тып паранойнага дыктатара з псіхалёгіяй падазронасьці і недаверу. Адсюль — частыя зьмены кадраў і пэрыядычныя чысткі.

Мэтадам заспакаеньня падазронасьці і спосабам прадухіленьня пагрозы быў страх, насаджэньне страху ў асяроддзі ўлады перад сваёй асобай.

На гэтым пэўнае падабенства паміж Сталіным і Лукашэнкам заканчваецца.

І па маштабу асабовасьці, і па прыродзе ўлады — гэта розныя тыпажы. Дыктатура Сталіна грунтавалася на партыйнай ідэалёгіі і на аднапартыйнай таталітарнай сістэме. Абсалютызуючы сваю ўладу, Сталін стварaў таталітарную тэрарыстычную ваенную дзяржаву і быў зацікаўлены ў яе існаваньні. Ён сфармаваў сістэму, якая стварала яму ***культ асобы***, культ „бязгрэшнага“ правадыра.

Было створанае ўражаньне, што ва ўсіх недахопах вінаватыя шкоднікі, але не Сталін, які нібыта наводзіў парадак. Адсюль рэпрэсіі і шалёны тэрор, дзясяткі мільёнаў забітых людзей.

Лукашэнка — гэта ёсьць дыктатар-марыянэтка, кіруемы спэцслужбамі і ўладамі чужой дзяржавы. Марыянэткавы рэжым Лукашэнкі ня мае ідэалёгіі, не абапіраецца на партыйны таталітарызм і не стварае таталітарнай дзяржавы. А гэта значыць, што ў яго няма рэальнай ***самастойнай*** сілы, што ён уяўны, штучны і залежны.

Канцэнтрацыя ўлады не стварае Лукашэнку культу асобы, а

***ўмацаваньне*** ягонай улады паклікана не на разьвіцьцё, а на развал беларускай дзяржавы, яе нацыянальнай культуры і эканомікі, на падрыхтоўку здачы яе ў Расею.

Рэжым Лукашэнкі мае ўсе прыкметы чужога акупацыйнага рэжыму.

Дыктатура асабістай улады Лукашэнкі пазбаўлена стратэгічнага абсалютнага зьместу, бо сэнс ягонай палітыкі — ўваходжаньне Беларусі ў сістэму іншай дзяржавы. У такім становішчы ня будзе існаваць дыктатура Лукашэнкі. Тут алягізм, абсурд.

Параўнаньне Лукашэнкі са Сталінам — недарэчнае. Лукашэнка ня ёсьць клясычным дыктататарам, гэта тыповы сатрап, стаўленік, службовая асоба чужой стратэгіі і залежнай палітыкі.

* * *

Сталінская вынішчальная акупацыйная палітыка і генацыд 1920-1940-х гадоў на Беларусі падарвалі беларускія сілы. Сталіністы-энкавэдзісты забілі лепшых людзей нашай краіны, зьнішчылі беларускае сялянства, выкрэсьлілі з жыцьця цэлае пакаленьне беларусаў, разбурылі набыткі беларускай культуры, перарвалі эстафету гістарычнага нацыянальнага разьвіцьця.

Падабенства цяперашняга антыбеларускага рэжыму са сталінскім зыходзіць якраз з гэтай акалічнасьці і заключаецца, перш за ўсё, у перасьледзе ўсяго беларускага, у перасьледзе беларускай мовы, у шалёнай і гвалтоўнай русіфікацыі, у бяспраўі людзей перад дзеяньнямі ўлады, у насаджэньні страху ў грамадзтве, ў адлучэньні беларусаў ад зямлі.

Гэта галоўнае. Гэта асноўныя праявы акупацыйнай прарасейскай дыктатуры.

*Варшава, 2003 г.* **Зянон ПАЗЬНЯК**

# ПУСЬЦІ СЬВІНЬНЮ ЗА СТОЛ

Спадар ***Віктар Альхімовіч***, дацэнт сталічнага медычнага ўнівэрсітэту, атрымаў лекцыю расейскага інтэрнацыяналізму. Ён прызнаўся: „Мне скора 60 гадоў. Я ніколі не цікавіўся нацыянальным пытаньнем, пакуль у маёй хаце не зьявіўся зяць-расеец. Учора сядзім за сталом, вячэраем. Зяць раптам кажа: „А нет такого белорусского языка. Это выдумкі националистов, а все белорусы — это неполноценные русские".

Вось так, у маім доме, за маім сталом, ядучы беларускі хлеб...

Што ж будзе, калі з Расеі абрынецца на нашу Беларусь 300 тысячаў іхніх вайскоўцаў з сем'ямі (разам — мільён), як абяцаюць нам Лукашэнка з Пуціным?

***Ангеліна МАСЮТА***

# ТЫПОВЫ ПЕРАСЬЛЕД БЕЛАРУСАЎ ЗА ПАЛІТЫЧНУЮ ДЗЕЙНАСЬЦЬ

Адміністрацыя Барысаўскага завода вырашыла пазбавіцца ад палітычна актыўнага супрацоўніка ***Сяргея Пескіна***. „Першая сур'ёзная размова са мной адбылася пасьля 19 красавіка, — кажа спадар Пескін, — калі мяне затрымалі на маршы пратэста. Мяне выклікаў начальнік аддзела кадраў і начальнік цэха. Сказалі, што дырэктар жадае мяне звольніць і ўжо атрымаў згоду ад прафсаюзнага камітэту. Летам майму сыну не далі пуцёўку ў аздараўляльны лягер, таму што я зьяўляюся сябрам Свабоднага прафсаюза Беларускага. Я адзіны з завода не атрымаў гэтую пуцёўку. Астатнім давалі нават па 2, па 4 разы. Сказалі, што я не зьяўляюся сябрам прафсаюза афіцыйнага, таму пуцёўку сыну не дадуць.

Пасьля пікету ля Расейскай амбасады 19 жніўня мяне выклікаў дырэктар, папярэдзіў: калі я ня скончу сваю апазыцыйную дзейнасьць, мне прыдзецца шукаць іншае месца працы.

Апошні раз мяне затрымалі за пікет. Пасьля гэтага зьявіўся загад, што мяне трэба скараціць да 20 лістапада ў сувязі са зьмяншэньнем штатаў."

Раней з завода звольнілі ***Людзьмілу Шчарбакову*** і ***Алесю Ясюк*** („Народная Грамада"). Сябра С. Пескіна ***Ігара Закрэўскага*** таксама затрымлівалі некалькі разоў за апошні год. Ён працуе на Барысаўскім заводзе „Гідраўзмацняльнік". Па ініцыятыве адміністрацыі на заводзе пачаўся збор подпісаў пад заявай з патрабаваньнем зволіць Ігара (ці перавесьці на іншае месца працы) за „недапушчальныя паводзіны ў вольны ад работы час".

***(Паводле радыё. Л. Лунёва)***

# ЗЯМЛЯ

*Сялянаў, прыхільнікаў Адраджэньня і Вызвольнага Руху, найбольш непакоіць найгалоўнейшае пытаньне нацыянальнага існаваньня — пытаньне зямлі. Бяда ня толькі ў той вынішчальнай прамаскоўска-акупацыйнай палітыцы, якую праводзіць антыбеларускі рэжым, але і ў тым, што за гады савецкай навалы чужынцы зьнішчылі традыцыйнае беларускае сялянства, разбурылі гаспадаркі і адвучылі людзей ад зямлі. Гэта найгорш. Бо на зямлі зможа добра працаваць той, хто яе любіць.*

*Нягледзячы на неспрыяльны цяперашні стан, і зараз трэба змагацца за зямлю і цяпер можна на ёй гаспадарыць, хоць гэта вымагае ад чалавека шмат волі, характару і працы. Ніжэй мы зьмяшчаем практычныя меркаваньні* ***Уладзімера Хахлуна***. *Сэнс ягоных развагаў — што ня ўсё страчана, працаздольны беларус, нягледзячы ні на што, мусіць загаспадараваць сваю зямлю. Магчымасьці трэба скарыстаць усе, якія ёсьць. Была б ахвота, розум, здароўе і воля.*

## *Плян-схема нацыянальнага валоданьня зямлёй на Беларусі*

Час прысьпешвае. Галоўная задача нашай Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ і Фронту на бліжэйшы час — падняцьцё нацыянальнай самасьвядомасьці грамадзянаў Беларусі. Адзін з напрамкаў у гэтай дзейнасьці — прыклад жыцьцяздольнасьці і эфектыўнага разьвіцьця ***нацыянальнага гаспадараньня*** (прадпрыймальніцтва) ў Беларусі.

Адзін зь відаў прадпрыймальніцтва — сялянская гаспадарка. (Як кажуць цяпер на амэрыканскі лад, — фермерства.)

Зямля — аснова ўсяго жывога на Зямлі, самае дарагое, што ёсьць у чалавека — Бацькаўшчына і Радзіма, адна з галоўных нацыянальных каштоўнасьцяў народа.

Ажыцьцяўляючы плян нацыянальнага валоданьня-карыстаньня зямлёй, мы паварочваем людзей, грамадзтва да сваіх каранёў, да сваёй гісторыі, культуры, традыцыяў. Ствараем беларускамоўны асяродак у глыбінцы.

Зямля — база для дзейнасьці Партыі пры вырашэньні праграмных задачаў.

Таму валоданьне зямлёй (тэрыторыяй) — жыцьцёвая неабходнасьць.

Акрамя таго, зямля — гэта сродак, які ніколі не губляе сваей матэрыяльнай каштоўнасьці, а наадварот, пры разумным карыстаньні ёй, павялічвае свой сабекошт.

Я лічу, што яшчэ цяперака ў Беларусі ёсьць юрыдычныя і фактычныя ўмовы дзеля карыстаньня і валоданьня зямлёй.

Трэба маральна і матэрыяльна падтрымліваць грамадзянаў, якія вядуць сялянскую гаспадарку. Гэтыя людзі павінны адпавядаць двум умовам:

— **першае**: яны павінны падтрымліваць нацыянальную ідэю і ідэалёгію Адраджэньня Беларусі, што будзе пэўным гарантам укладаньня матэрыяльных сродкаў. У сучасных абставінах на Беларусі прыхільнасьць да беларускага, а тым больш дзеяньні ў гэтым накірунку мяжуюць зь небясьпекай для сябе асабіста і сваёй сям'і;

— **другое**: чалавек павінен любіць зямлю, мець жаданьне працаваць на ёй, верыць у магчымасьць арганізацыі і галоўнае — эфектыўнага разьвіцьця сялянскай гаспадаркі ў цяперашніх цяжкіх эканамічных, палітычных, сацыяльных і маральных умовах на Беларусі. Грамадзянін атрымлівае магчымасьць карыстацца зямлёй пры ўмове, што будзе яе

апрацоўваць, і паказчыкі вытворчасьці сельгаспрадукцыі павінны быць ня меншыя за сярэдне-статыстычныя па раёне. Калі ж на працягу 2-х гадоў зямельны надзел не апрацоўваецца, то права на яго страчваецца.

Акрамя ўсяго, грамадзяне, якія будуць займацца вядзеньнем сялянскай гаспадаркі, не павінны ***непасрэдна*** ісьці на канфлікт з уладай, актыўна ўдзельнічаць у палітычнай барацьбе.

Кожны грамадзянін Беларусі, які пастаянна пражывае на пэўнай тэрыторыі, мае права ўзяць у пажыцьцёвае спадчыннае валоданьне да 100 *га* зямлі для вядзеньня сялянскай гаспадаркі. Акрамя таго, ёсьць магчымасьць пашырэньня зямельнага надзелу за кошт арэнды зямлі.

Адзін гактар зямлі грамадзянін Беларусі мае права мець у прыватнай уласнасьці.

Заканадаўствам дазваляецца арандаваць і мець ва ўласнасьць іншую маёмасьць, а таксама зваротныя сродкі, неабходныя для вядзеньня сялянскай гаспадаркі.

Першыя тры гады з моманту ўтварэньня гаспадаркі яна не абкладаецца ніякімі падаткамі. Надалей — адзіны 5% сельгаспадатак. Дзяржавай даецца пэўная самастойнасьць пры вырашэньні пытаньняў арганізацыі і вядзеньня сельскай гаспадаркі.

Зямля ў Беларусі выведзена з эканамічнага абароту, не зьяўляецца сродкам куплі-продажу і іншых грамадзянскіх дамоваў, таму ня мае кошту; і пры яе атрыманьні ня трэба нічога плаціць.

У іншых эканамічных абставінах кожны гактар будзе мець пэўны кошт, згодна з кадастравай адзнакай.

У краіне адсутнічае жорсткая канкурэнцыя сельгасвытворцаў (бо дзяржава падтрымлівае эканамічна стратныя калгасы і саўгасы). Тое, што адсутнічае канкурэнцыя, — станоўчы момант пры пачатку бізнэсу.

Да ўсяго гэтага трэба дадаць тое, што ў сельскай мясцовасьці ёсьць вялікая колькасьць пабудоў, якія можна выкарыстоўваць (купіць, арандаваць за невялікі кошт) для вядзеньня гаспадаркі. Гэта таксама тычыцца сельгастэхнікі і прыстасаваньняў да яе.

Нізкія заробкі ў калгасах і саўгасах дазваляюць разьлічваць на досыць танную працоўную сілу. Галоўным адмоўным чыньнікам у справе арганізацыі сялянскай гаспадаркі (улічваючы псіхалёгію „нашага" грамадзяніна) зьяўляецца адмоўнае стаўленьне людзей да працы на зямлі і яе вынікаў.

Пабудова сялянскай гаспадаркі можа ажыцьцяўляцца на базе прыватных гаспадарак бацькоў, дзядоў і іншых сваякоў, якія жывуць у сельскай мясцовасьці і ўжо маюць нейкі мінімум неабходнага для арганізацыі фермерскіх справаў (хата, сельскагаспадарчыя пабудовы, сельскагаспадарчы інвентар, насеньне, быдла, коні, арганічныя ўгнаеньні, сад) альбо, як у маім выпадку, на падставе маёмасьці, атрыманай у спадчыну.

Пры арганізацыі сялянскай гаспадаркі трэба ўлічваць тое, што ў краіне адсутнічае парытэт кошту на сельгаспрадукцыю, з аднаго боку, і на тэхніку, паліва, тукі і інш.— з другога; няма добра разьвітай матэрыяльна-тэхнічнай базы забесьпячэньня і абслугоўваньня сельскіх гаспадарак, адладжанай сістэмы збыту гатовай прадукцыі. Эканамічна не эфектыўна выкарыстоўваць тэхніку на невялікіх зямельных надзелах пры досыць нізкай ўраджайнасьці.

Улічваючы ўсё гэта, можна пачынаць ствараць сельскую гаспадарку пры 20-ці гактарах ворыва, апрацоўваючы яе коннай сілай (пара коней) і маючы ўсю неабходную малую (конную) мэханізацыю. Такая гаспадарка засноўваецца на асабістай працы гаспадара і членаў ягонай сям'і, пры дапамозе сваякоў і мінімальным выкарыстаньні наёмнай працоўнай сілы.

Гаспадарка першапачаткова разьвівае розныя галіны сельгасвытворчасьці: расьлінаводзтва (у аснове — кармы для жывёлы), малочную жывёлагадоўлю, птушкагадоўлю (вытворчасьць яек), вырошчваньне садавіны, бортніцтва, вырошчваньне лёну і зеляніны ў зімовы пэрыяд.

Перапрацоўка прадукцыі ажыцьцяўляецца ў гаспадарцы, а продаж (у асноўным) — цераз кірмаш.

Сельгаспрадукцыя, атрыманая пры такой арганізацыі і вядзеньні сялянскай гаспадаркі, будзе мець нізкі сабекошт.

Гаспадараньне на зямлі павінна спалучаць гістарычны вопыт дзядоў па апрацоўцы глебы і вядзеньні гаспадаркі і навуковы падыход пры выкарыстаньні толькі арганічных угнаеньняў.

Пры такіх падыходах да разьвіцьця фермерскай гаспадаркі яна будзе канкурэнтназдольная, адносна іншых сельгасвытворцаў па асноўных паказчыках:

— сабекошт прадукцыі;
— рэнтабельнасьць вытворчасьці;
— ураджайнасьць;
— якасьць прадукцыі;
— кадастравая адзнака глебы;
— экалягічныя паказчыкі.

Да ўсяго трэба дадаць, што такая гаспадарка не патрабуе вялікіх матэрыяльна-фінансавых укладаньняў.

Гэта асноўныя моманты пачатку стварэньня нацыянальнай сістэмы гаспадараньня на зямлі.

Пры гэтым я зыходзіў з асабістых поглядаў на разьвіцьцё сваей уласнай сялянскай гаспадаркі.

Галоўным у дадзеным становішчы на Беларусі павінна быць разуменьне таго, што мы павінны рэальна валодаць зямлёй (тэрыторыяй) і для гэтага ёсьць усе неабходныя ўмовы.

*Ліпень 2002 г.* ***Уладзімер ХАХЛУН***

# ЗАКЛАДНІКІ СЬМЕРЦІ

Ля Баранавічаў пачала „баявое дзяжурства" расейская радыёлякацыйная станцыя. Яна заклікана замяніць для Масквы аналягічную станцыю, якая раней была зьліквідаваная ў Латвіі у Скрундзэ.

Сёньня радыёлякацыйная станцыя ля Ганцавічаў (афіцыйна называецца „Вузел папярэджваньня пра ракетны напад „Баранавічы") заступіла на вопытна-баявое дзяжурства ў складзе касьмічных войскаў Расеі.

Станцыю пад Баранавічамі пачалі будаваць у савецкія часы, потым закансэрвавалі. Пасьля ліквідацыі СССР станцыя была беларускай маёмасьцю. А пасьля дэмантажу аналягічнай станцыі ў латвійскай Скрундзэ, Масква дамовілася з урадам **Кебіча** аднавіць яе будаўніцтва. Урад Кебіча аддаў недабудаваны аб'ект ва ўласнасьць Расеі.

Баранавіцкі аб'ект лічыцца цяпер (незаконна) расейскай маёмасьцю, сочыць за балістычнымі ракетамі.

12 сьнежня 2002 г. станцыя пачала афіцыйна працаваць на поўную моц.

Выпраменьваньне яе надзвычай шкоднае для ўсяго жывога ў ваколіцы на дзясяткі (і нават сотні) кілёмэтраў. Экалягічная шкода — катастрафічная. такія станцыі звычайна будуюць у бязьлюдных мясьцінах (у гарах ды пустынях).

Беларусы, што жывуць вакол станцыі, — гарантаваныя сьмертнікі і хворыя людзі. Усё гэта вядома было і ўраду Кебіча, і цяперашнім сатрапам Масквы на Беларусі.

***ЮС.***

# ПЛЯН ЗЬНІШЧЭНЬНЯ БЕЛАРУСКІХ БІБЛІЯТЭК

Ідэя перавесьці бібліятэкі на камэрцыйныя дачыненьні належыць чыноўнікам лукашэнкаўскага Міністэрства культуры. Тут спасылаюцца на адсутнасьць бюджэтнага фінансаваньня, а, маўляў, на зароблены ад чытаньня кніг грошы кожная бібліятэка быццам бы можа аднавіць свае сьціплыя і ў бальшыні — маральна састарэлыя фонды.

У гарадах, дзе колькасьць абанэнтаў большая і гвалтоўны пераход на неўласьцівую дагэтуль форму дачыненьняў можа выклікаць супраціў,

камэрцыялізацыя бібліятэкаў ідзе не такімі шпаркімі тэмпамі. Загадчыца бібліятэкі аршанскай вучэльні чыгуначнікаў *Ларыса Кліноўская* кажа: „У гарадзкой бібліятэцы ёсьць платны аддзел. Там літаратура, якую любіць народ (у яркіх вокладках, пераважна, дэтэктывы). Бібліятэкі зараз прымушаюць займацца камэрцыяй. Галіновыя афіцыёзныя часопісы пішуць, што бібліятэкі „павінны вучыцца зарабляць грошы самастойна".

Ніхто з адмыслоўцаў ня можа ўзгадаць прэцэдэнт, каб дзесьці ў цяперашнім сьвеце публічныя бібліятэкі бралі грошы з чытачоў. У крайнім выпадку, можа брацца задатак, калі справа тычыцца дарагіх фаліянтаў ці старадаўніх выданьняў. Але адсутнасьць нават мінімальнага фінансаваньня, неабходнага для жыцьцядзейнасьці грамадзкіх бібліятэк у Беларусі, вымушае мясцовыя ўлады згаджацца на разбуральныя „экспэрымэнты".

***(З радыё. І. Карней)***

# БЕЛАРУСЫ ПАД АКУПАЦЫЯЙ:

## *Страты на ўсё жыцьцё*

*(Са словаў Георгія Парфіравіча Тумiловіча запісала Вольга Кацянкова. 2002 г., Менск)*

Наша сям'я Туміловічаў да вайны жыла ў вёсцы *Магільна Ўзьдзенскага раёну*. Маці Марыя і бацька Парфірый мелі дзевяць дзяцей. Напачатку вайны старэйшаму брату Івану было 18 гадоў.

Праз нашу вёску ўцякалі ад немцаў два савецкія афіцэры-дэзэрціры. Наша хата была апошняй на іхным шляху ў лес, і яны пакідалі свае наганы нам у жыта. Бацька пабачыў гэтыя наганы і схаваў іх. Пра гэтыя наганы ведаў і брат Іван.

Аднойчы ў верасьні прышлі да нас уначы чатырох партызанаў. Былі яны з атрада імя Катоўскага (камандзір Яроменка); атрад уваходзіў у брыгаду імя Варашылава, начале якой стаяў генерал-маёр Капуста.

Увайшоўшы ў хату, яны паднялі Івана з ложка і загадалі ісьці зь імі. Яны не пыталіся ягонай згоды, але і непадпарадкоўвацца ім Іван ня мог. З сабой ён захапіў адзін з тых наганаў, што кінулі ў жыта чырвоныя афіцэры.

Як жылося Івану ў партызанах нам не было вядома. У сьнежні 1942 г. немцы падрыхтавалі аблогу партызанаў. Каб затрымаць немцаў на шляху да лесу, камандзіры накіравалі групу з 21 чалавека ў засаду. Засаду зрабілі на могілках ля вёскі *Лавы*. Але могілкі з усіх бакоў былі адкрытыя, кругом поле, лес ад іх быў далёка. І людзі гэтыя былі, фактычна, пасланыя на сьмерць, толькі для таго, каб нейкі час затрымаць немцаў.

Быў загад: жывым не здавацца.

Калі партызаны, што былі ў засадзе, убачылі колькасьць і моц нямецкіх сілаў, трох зь іх ня вытрымалі і пабеглі. Прыйшоўшы ў атрад, яны сказалі, што прыбеглі па дапамогу. Але падмогу ніхто пасылаць не зьбіраўся.

18 партызанаў прынялі бой. Хутка немцы іх акружылі. Усе яны загінулі, хто ад кулі, хто застрэліўся сам. Сярод 18-ці быў мой брат Іван. Ён застрэліўся з таго нагана, што ўзяў з дому, калі яго забіралі ў партызаны.

Праз пару дзён вестка пра Лаўскі бой дайшла да нашай вёскі, і бацькі, чые дзеці былі ў партызанах, прыехалі на месца бою. Бацька наш знайшоў на могілках мёртвым нашага Івана.

Яшчэ двое вяскоўцаў таксама знайшлі там сваіх сыноў. Бацькі забралі іх, прывезьлі ў вёску і пахавалі на досьвітку на вясковых могілках.

А ўдзень прыехалі ў вёску паліцаі зь немцамі, знайшлі маладога хлопца, які паказаў ім усе хаты партызанскіх сем'яў. Наша сям'я хавалася па суседзях, але на той момант мама з дваімі малодшымі дзецьмі пайшла ў сваю хату, каб пакарміць жывёлу. Я прыбег і папярэдзіў яе, што ў вёсцы немцы, але яна, змучаная і прыгнечаная сьмерцю і пахаваньнем Івана, адказала, што ёй усяроўна, што яна нікуды ня пойдзе. У яе не было сілы бегчы і хавацца. Я пабег да суседзяў.

У гэты час зайшоў у хату мой брат Рыгор, трохі старэйшы за мяне. І не пасьпеў ён выйсьці, як зайшлі два паліцаі і немец. Адзін з паліцаяў спытаў маці: „Ну, што, пахавала сына? — і дадаў, — А зараз зьбірайся сама, бяры дзяцей і паедзеш з намі".

Маці пайшла ў пакойчык сабраць рэчы для дзяцей, паліцай і немец пайшлі за ёй усьлед, а другі паліцай, што быў ля парога, пашкадаваў Рыгора і параіў яму апрануцца і ўцякаць прэч.

Рыгору ўдалося схавацца і пазьбегнуць сьмерці. А маці з дваімі маленькімі дзеткамі (Надзеяй і Лёняй) павезьлі на конях у Узьдзенскі гарнізон. З васьмі хат забралі ўсіх, хто быў: дарослых, дзяцей, старых.

Гэта было 6-га сьнежня 1942 года. Ніхто зь іх не вярнуўся. Недзе 12-га сьнежня іх усіх расстралялі. Дзе пахаваныя мае родныя і аднавяскоўцы дакладна невядома.

Пасьля гэтых падзеяў бацька і мы, шасьцёра дзяцей, вымушаны былі жыць у зямлянцы за 5 кілёмэтраў ад вёскі, зрэдку наведваючыся ў сваю хату. Баяліся, каб і нас усіх не забілі. Нацярпеліся шмат, асабліва зімой было цяжка.

Адны акупанты (расейскія чырвоныя камандзіры — бальшавікі) прымусова забіралі нашу моладзь у партызаны, а другія, нямецкія, расстрэльвалі сем'і гэтых партызанаў. Той, хто арганізоўваў гэту партызаншчыну, разумеў, што будзе гінуць нічым непавінны люд. Але пра наш беларускі народ Масква ніколі ня думала добра, як ня думае і цяпер. Толькі імпэрскія інтарэсы кіруюць Масквой.

Бацька наш выгадаваў нас. Рыгор да гэтага часу жыве ў Магільна. Дзьве мае сястры жывуць у Менску, я таксама побач зь імі. Другія дзьве сястры ўжо памерлі ад хвароб, хоць і не былі яшчэ старыя. Ніхто з маіх сясьцёр не атрымалі спэцыяльнай адукацыі: трэба было працаваць, было не да вучобы. Дапамагалі бацьку гадаваць адзін аднаго. Я закончыў ФЗО, сярэднюю школу працоўнай моладзі, працую наладчыкам.

Думкі пра акупантаў не пакідаюць мяне, а калі ўсё гэта ўспамінаю — маму, братоў, сясьцёр — то цяжка стрымаць сьлёзы. Шкода, і агортвае мяне жаль.

## *„І ніхто не вярнуўся"*

*(Сафія Табола пра лёс роду. Заазерцы, Шаркаўшчынскі раён)*

Я нічога ня ведала пра перажытае маімі роднымі недзе гадоў да 12-ці. Першы пра „кулакоў" расказаў мне дзядуля „на кудзелі". Ён жыў на лясным хутары *Струбкі* (зараз Нова-Пагоскі сельсавет Мёрскага раёна). Мае тата і мама памерлі маладымі, я памятаю іх ужо хворымі; вось і гадавалася я ў дзядулі на тым лясным хутары.

Мы жылі неяк адасоблена, але калі я зрэдку хадзіла ў краму ў вёску, то аднойчы пачула ад дзяцей: „кулацкае адроддзе". Запыталася ў дзядулі: „Чаму мяне так назвалі?"

Якія „кулакі" благія я добра „ведала". У школе вучылі: не працуюць, зь бедных людзей кроў п'юць. І пра „мужнага" Паўліка Марозава, які „геараічна" загубіў уласнага бацьку, — таксама ведала. Яго „ганаровае" імя насіла наша піянерская дружына. Вось тады і расказаў мне дзядуля, што перажыў ён і яго сям'я. Пасьля я ня раз прасіла яго расказаць мне пра тыя далёкія і незразумелыя мне тады гады.

„Першыя саветы" ( так называў іх дзядуля) ў 20-х гадах „вялікай шкоды не нарабілі, хутка прыйшлі і хутка пайшлі. А вось другія, якія ў 1939 годзе на галоўку беларусаў навязаліся, то да гэтага часу людцы ад іх пазбавіцца ня могуць. Шмат гора яны людзям прынесьлі."

Адной з ахвяраў стала сям'я дзядулі. Жылі яны за польскім часам моцна, мелі 70 *га* зямлі (25 — ворыва, астатняе — лес і лугі). Дзядуля меў і вялікі пладовы сад, які займаў каля 2-х *га*, 40 калодаў пчол, вялікую гаспадарку: трое коней, 6 кароў, а „дробязь" ён не лічыў (сьвіньні, авечкі, куры).

І дзядуля, і бабуля былі адукаванымі для свайго часу людзьмі, скончылі гімназію, а дзядуля — і сельскагаспадарчую школу. Да канца сваіх дзён зьберагаў дзядуля плян свайго зямельнага ўчастка, які быў складзены спэцыяльна запрошаным аграномам, каб эфектыўна весьці гаспадарку. У сям'і было 12 чалавек. Бабуля з дзядулям, дзевяць дзяцей і маці бабулі (прабабуля) ***Папова Марфа Карпаўна***. Яна і загінула першай, калі пачалася гэта „кампанія". Ня вытрывала сэрца. Памерла ад інфаркту, як я зараз разумею.

Пра раскулачваньне яны даведаліся ад свайго дзядзькі, ***Янкі Сапарунскага***, які кінуў усё нажытае і ўцёк у Польшчу. Дзядзька

прапанаваў дзядулі ехаць разам зь ім, але куды з такой сям'ёй? І дзядуля застаўся. Тэрмінова падзяліў зямлю і маёмасьць паміж паўналетнімі дзецьмі (на той час паўналецьця дасягнулі чацьвёра ягоных дзяцей), думаў, што гэта дапаможа ўратавацца. Але яго раскулачылі першым у акрузе. Прыехалі днём у канцы жніўня 1946 года, спачатку пагрузілі на падводы скарб. Бабуля, калі выносілі апошні мяшок жыта, кінулася на яго і лягла, сьледам дзеці (пяцёра, ад 15-ці да 7-мі гадоў). І гэты мяшок ім пакінулі. А потым зьвязалі дзядулю і, прывязаўшы да падводы, павялі (дакладней, пагналі, як жывёлу) у Мёры. Бабуля зь дзецьмі засталася.

Я спыталася ў дзядулі, чаму ўсю сям'ю ня вывезьлі. На гэта дзядуля адказаў: „Грошы любяць усе." Думаю, ён заплаціў нейкаму камісару, і яго забралі аднаго. Зьвезьлі ў Сібір. Зараз ужо ня памятаю, куды. Ведаю толькі, што там ён працаваў на лесанарыхтоўках. Быў ён там тры гады. Потым здабыў (таксама купіў) нейкую даведку, якая дазваляла яму вярнуцца дамоў.

Вярнуўся да „разбуранага гнязда". Бабуля зь дзевяцёра дзяцей семярых выправіла ў „людзі". Хто завербаваўся, дочкі пайшлі працаваць служанкамі, і мая мама таксама. Ёй было 17 гадоў. Але гэта ўратавала сям'ю ад фізічнага вынішчэньня.

Дзядуля, два ягоныя сыны (***Васіль*** і ***Нікіфар***) і зяць (***Савасьцей Дзянісаў***) ваявалі на баку саветаў, Васіль быў у палоне ў Бухенвальдзе. Усе яны мелі ўзнагароды, а дзядуля — і Георгіеўскі расейскі крыж за Першую Сусьветную вайну, але іх раскулачылі.

Калі я спытала ў дзядулі: „Навошта ж вы абаранялі такую ўладу?" — дзядуля адказаў: „Мы абаранялі Радзіму."

Гэтак вось разбурылі спакон веку сялянскую беларускую сям'ю. Усе дзеці, акрамя мамы, жылі ў гарадах. Толькі праз гады я зразумела, як сумавалі яны без сялянскай працы! Бывала, прыедзе каторы дзядзька ў адпачынак і бярэцца гараць агарод. З раніцы да вечара. Стомленыя, як яны зь любасьцю глядзелі на зямлю! На жаль, адарваныя ад яе, практычна, усе пілі гарэлку і памерлі заўчасна.

Да дзядулі часта заходзіўся жабрак. Звалі яго ўсе ***Юстын***. Усе думалі, што ён хворы на галаву. Але аднойчы я падслухала іхнюю размову. Дзядулю і гэтага чалавека ў адным эшалоне расейцы везьлі ў Сібір, але той зьбег па дарозе. Быў ён ня з нашай мясцовасьці, ніхто пра яго нічога ня ведаў. Калі да дзядулі хто прыходзіў, гэты чалавек прыкідваўся дурнаватым. Браў газэту дагары нагамі і такія вершы выдаваў. Усе „вершы" былі сьмешныя „прысьвечаныя" маскалям-бальшавікам. Але былі яны з непрыстойнымі словамі.

Зь іхных размоваў я зразумела (дзядуля ня ведаў, што я на печы ў хаце), што жонку і дачку Юстына бальшавікі застрэлілі. Па дарозе ў Сібір жонка прыглянулася нейкаму бальшавіцкаму начальніку. Яе забралі, і яна з дачушкай ўжо не вярнулася ў вагон-цялятнік. На некаторых станцыях, як іх везьлі, цягнік стаяў суткамі, людзей не кармілі, не давалі піць.

А вось сям'я майго таты жыла ў Магілёўскай вобласьці, Шклоўскі раён, вёска Новыя Чамаданы, АС Гарадзец. Дзядулю (па тату) абралі старшынёй калгаса. 1939 год стаў для іх фатальным. Спачатку ў Магілёве арыштавалі старэйшага брата таты ***Антона Сякацкага*** (сам тата быў у войску на тэрміновай службе на фінскай мяжы). Ён быў вайскоўцам. У гэты час заводзіліся справы на вышэйшых савецкіх камандзіраў, у тым ліку і на Тухачэўскага, у штабе якога служыў дзядзька Антон. Толькі ў 60-х гадах даведаліся мы, што ён адмовіўся падпісваць паперы па абвінавачваньні свайго камандзіра, і яго прывезьлі на допыты ў Менск. Бабулі паведамілі, што ён асуджаны на 10 гадоў бяз права перапіскі. Значыць, яго расстралялі, і магчыма, у Курапатах.

Сьледам арыштавалі дзядулю, ***Сякацкага Венідзікта Амброзіевіча***. І калі дзядзька Антон „быў" „шпіёнам" нямецкай разьведкі, то дзядуля аказаўся „англійскім шпіёнам". Калі яго прыйшлі арыштоўваць, то адразу пад страхой над уваходам у хату знайшлі абрэз. Толькі падымі галаву — і зброя на вачах. (Ну хто ж хаваў бы так зброю!) А на этажэрцы з падручнікамі „знайшлі" „інструкцыі" шпіёнам на ангельскай мове!

Дзядуля замест подпісу ставіў крыжыкі, ён на роднай мове чытаць ня ўмеў. (Але ўсіх дзяцей вучыў.) Разам з дзядулям арыштавалі яшчэ аднаго ягонага сына Івана, і зяця (мужа цёткі Антаніны Казакевіч). Усяго ***ў вёсцы забралі 17 чалавек***. Пасьля вайны ніхто не вярнуўся. Бабуля спрабавала даведацца пра лёс мужа і сыноў. Яна знайшла ў Шклове сьведку, які быў у лягеры пад Уфой, разам з дзядулем. Ён і расказаў ёй, што дзядуля памёр ад голаду ў 1942 годзе. А на дзядзьку Івана даслалі ліст, што ён рэабілітаваны, таму што загінуў пад Масквой у 1942 годзе ў пачатку студзеня ў штрафным батальёне. Дваюрадны брат мамы ***Іван Якаўлевіч Сякацкі*** адразу пасьля арышту спрабаваў даведацца, што чакае дзядулю і астатніх арыштаваных. Ён расказваў, што падкупіў нейкага начальніка ў Магілёўскай турме, і яму дазволілі сустрэцца з дзядулям. Дзядуля быў зьбіты скатаваны, твар апухшы ад пабояў, паламаныя рэбры і пальцы на руках. Ён толькі папрасіў перадаць бабулі, каб дзеці разьбягаліся, зьязджалі з родных мясьцінаў, каб уратавацца. Яны так і зрабілі.

У гэты час татава сястра ***Соф'я Венідзіктаўна Сякацкая*** працавала настаўніцай. Да яе прыехала з раяна чыноўніца і забрала камсамольскі білет, а назаўтра тая ж чыноўніца сабрала сход камсамольскі і „паведаміла", што цётка Соня не паважае камсамол і аддае білет каму папала. Але калі цёця аддавала білет, яна спыталася, чаму яго забіраюць і папрасіла чыноўніцу паказаць партыйны білет. Чыноўніца паказала. Цёця Соня запомніла нумар яе партыйнага білета. І на сходзе сказала, што выконвала загад „старэйшага таварыша" камуніста. І сход цётку Соню апраўдаў, таму што яна назвала нумар. Адразу пасьля гэтага сходу яна зьехала ў другую мясцовасьць і выйшла замуж за такога ж „члена сям'і ворага народа". Вядома ж, іх бы знайшлі, перашкодзіла (ці дакладней, выратавала) вайна.

Але і пасьля вайны паляваньне за сям'ёй не спынілася. У 1945 годзе восеньню была арыштаваная яшчэ адна сястра таты ***Браніслава Сякацкая***. Яна была фельчарам, усю вайну прайшла з савецкім медсанбатам. Яе сьлядоў мы не знайшлі: ні бабуля, ні тата, ні я. Чалавек зьнік бяз вестак. Арыштавалі яе ў Калінінградзе проста ў шпіталі. Гэта пацьвердзіў яе былы пацыент, які прыязджаў да бабулі ў 1946 годзе і прывёз нейкія рэчы цёці Броні.

З 1939 па 1946 гады ***арыштавалі 11 чалавек*** з татавай радні. Ніхто зь іх не вярнуўся.

# НІЗКІЯ МЭТАДЫ МЯСЦОВАЙ УЛАДЫ Ў ПІНСКУ

*13 сьнежня*, на трэці дзень судовага працэсу ў гарадзкім судзе г. Пінска, суддзя **Р**. **Лабачэўская** вынесла прысуд сябрам *Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі – БНФ сп.* ***Лявону Вабішчэвічу*** і *сп.* ***Ігару Саракавіку*** – 10 сутак адміністрацыйнага арышту. Яны былі абвінавачаны ў „парушэньні месца пікетаваньня" на пяць мэтраў (!).

26 лістапада сёлета сябры фронтаўскай Партыі арганізавалі пікет у цэнтры Пінска ў падтрымку гераічнай барацьбы чачэнскага народа за свабоду і незалежнасьць супраць расейскіх акупантаў. *Сп. Л.Вабішчэвіч* і *сп. І.Саракавік* былі заяўнікамі гэтага пікета. Як заўсёды, „сьведкамі" па справе выступілі міліцыянты: капітан **С**.**Шахновіч**, лейтэнанты **А**.**Палеха** і **С**.**Шкутовіч**. Суддзя кіравалася не нарматыўнымі актамі, а афіцыйным лістом, дасланым папярэдне ў гарадзкі аддзел міліцыі **А**.**Канеўскім**, намесьнікам старшыні гарвыканкама (і адначасова гарадзкім кіраўніком мясцовай арганізацыі камуністычнай партыі — КПБ). У лісьце сярод іншага напісана: „ГОВД предлагается задокументировать возможные нарушения места пикетирования".

Такім чынам, правакацыя супраць грамадзянаў была заранёў падрыхтаваная прадстаўнікамі рэжыму. Пасьля вынясеньня прысуду міліцыянты узялі *сп. Л.Вабішчэвіча* і *сп. І.Саракавіка* пад варту, замкнулі ім на рукі кайданкі.

Гвалтоўная правакацыя ўладаў і судовая расправа над беларускімі патрыётамі, якія *выказалі салідарнасьць з чачэнскім народам – барацьбітом супраць расейскай агрэсіі*, сьведчыць пра халуйскі характар




*Дэманстрацыя ў Пінску*

прамаскоўскага рэжыму Лукашэнкі на ўсіх ягоных узроўнях. Але таксама гэта сьведчыць пра тое, што рэжым баіцца народнага супраціву расейскай агрэсіі ў Беларусі.

***(Прэс-служба БНФ. В. БУЙВАЛ)***

# ДАВЕРЛІВЫЯ ЛЮДЗІ Ў СЕТКАХ РУСКАЙ МАФІІ

Аб’яву пра пошук супрацоўнікаў у расейскую фірму Сяргей Жураўскі ўбачыў восеньню 2001 г. у Аршанскім Цэнтры занятасьці насельніцтва. Аб’ява была зьмешчаная на адмысловым стэндзе для вакансіяў. Калі ён выказаў жаданьне ўладкавацца на прапанаваную працу, супрацоўнікі Цэнтра ў ягонай прысутнасьці скантакталіся з прадстаўнікамі расейскай фірмы. Неўзабаве С. Жураўскі сьціраваўся на сваё новае месца працы.

„Я паехаў у Смаленскую вобласьць у Гранскі раён. Паабяцалі прыстойную аплату (300 даляраў і вышэй на месяц). Трэба было будаваць завод (як сказалі). Працаўнікі былі з большага — беларускія грамадзяне: хлопцы з Гарадка, Віцебску, з Обылі, з Багушэўску, Воршы. 90% зь іх — падманулі і не заплацілі.

Фірма „Сітэк” знайшла адмысловы сродак для разьліку са сваімі працаўнікамі. Людзей падманам вывозілі з „аб’екта” ды проста пакідалі на дарозе.

См С. Жураўскі атрымліваў каля 1000 расейскіх рублёў, што складае 30 даляраў (замест абяцаных трохсот). Яму плацілі хаця б нейкія грошы толькі з-за таго, што ён быў асабліва каштоўны працаўнік. Па словах спадара Жураўскага, менавіта ягоная адукацыя дазволіла яму зразумець, што будаўніцтва заводу ня толькі ня мае тут пэрспэктывы, але, магчыма, зьяўляецца шырмаю дзеля нейкай іншай дзейнасьці фірмы „Сітэк”. Якой менавіта? Ён палічыў за лепшае не высьвятляць ды найхутчэй зьбег з сумніўнага аб’екту.

С. Жураўскі паскардзіўся на сваіх „працадаўцаў” у расейскую пракуратуру. Але ніякіх вынікаў гэта не дало. А без рашэньня пракуратуры, падаваць у расейскі суд ён лічыць дарэмным. Тым больш ня верыць ён у магчымасьць абараніць свае правы ў беларускім судзе.

***(Паводле радыё. Б. Станкевіч)***

# МЕНСК. ПАВЕДАМЛЕНЬНІ З ФРОНТУ

*3-га кастрычніка* сябры *Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі – БНФ* сабраліся ля помніка ***Янку Купалу*** ў Менску на традыцыйныя шточацьвярговыя паэтычныя чытаньні. Свае вершы чытаў паэт ***Генадзь Тумаш***. Актуальна прагучалі ў ягоным выкананьні творы, прысьвечаныя гераічнай барацьбе чачэнскага народа за свабоду і незалежнасьць супраць расейскай агрэсіі. Ярка выступіў прафэсар ***Аляксей Саламонаў***. Вядомы майстра старажытнабеларускіх інструмантаў, музыкант ***Уладзімер Пузыня*** іграў на сурме і дудзе. Людзі з захапленьнем слухалі вершы, выступы і музыку.

*5 кастрычніка* сябры *Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі – БНФ* прышлі ў ***Курапаты*** на штосуботнюю талаку. Нягледзячы на дождж, прыбіралі тэрыторыю ***Народнага Мэмарыялу***, даглядалі магілы. Усе маглі пабачыць, якая небясьпека пагражае народнай сьвятыні. На тэрыторыі, непасрэдна блізкай да мэмарыялу, антыбеларускія ўлады разгарнулі будаўніцтва. Будуецца разрэклямаваны „горад сонца”: агромністы комплекс супэрмаркетаў і забаўляльных цэнтраў, а таксама цэлы комплекс катэджаў.

Вядома, што найбольш актыўнымі ў рэалізацыі сатанінскай ідэіператварэньня Курапатаў у „забаўляльную і жылую зону” зьяўляюцца **расейскія фірмы**. І таксама **расейская праваслаўная царква**, якая ўжо пачала садзіць гароды ў 15 мэтрах ад курапацкіх магілаў. Аўтары і выканаўцы гэтага шалёнага пляну павінны ведаць, што іхнія намаганьні марныя і будучыні яны ня маюць.

*10 кастрычніка* сябры *Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі – БНФ* правялі ў Менску перад помнікам Янку Купалу традыцыйныя шточацьвярговыя літаратурныя чытаньні.

*12 кастрычніка*, нягледзячы на халоднае і дажджлівае надвор’е, сябры *Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі – БНФ* правялі *ў Курапатах* традыцыйную штосуботнюю талаку, прыбіралі тэрыторыю Мэмарыялу, ліквідавалі сьляды нядаўняга ўварваньня тэхнікі на пляцоўку перад *Крыжом Пакутаў*.

*17 кастрычніка* сябры *Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі – БНФ* сабраліся каля помніка *Янку Купалу* ў Менску на традыцыйныя шточацьвярговыя літаратурныя чытаньні. Зноў гучалі вершы ***Янкі Купалы*** і ***Якуба Коласа***.

*19 кастрычніка* сябры *Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі – БНФ* прыйшлі ў ***Курапаты*** на традыцыйную штосуботнюю талаку. Даглядалі магілы, прыбіралі тэрыторыю ***Народнага Мэмарыялу***.

*24 кастрычніка* сябры *Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі – БНФ* сабраліся каля помніка *Янку Купалу* ў Менску на традыцыйныя шточацьвярговыя літаратурныя чытаньні. Чыталі вершы і фрагмэнты прозы ды артыкулаў нашых песьняроў. Як заўсёды, да грамады далучаліся людзі, што з цікаўнасьцю слухалі дэкляматараў і выступоўцаў.

*26 кастрычніка* сябры *Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі – БНФ* зноў прышлі ў *Курапаты* на традыцыйную штосуботнюю талаку. Прыбіралі тэрыторыю мэмарыялу, рыхтуючыся да Дня памяці продкаў Дзяды. Шасьцёра сяброў партыйнай арганізацыі зь Нясьвіжа прывезьлі і ўсталявалі на крыжовай алеі ***Крыж ад жыхароў Нясьвіжа***. Крыж быў выраблены на сродкі, ахвяраваныя людзьмі.

*31 кастрычніка* сябры *Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі – БНФ* правялі чарговыя літаратурныя чытаньні каля помніка *Янку Купалу* ў Менску, дэклямавалі вершы, гаварылі пра сёньняшнюю нацыянальную літаратуру і грамадзкую пазыцыю творцаў. З інфармацыяй пра літаратурныя працэсы выступіла сябра Партыі кандыдат філялягічных навук ***Валянціна Мароз***.

*2 лістапада Кансэрватыўна-Хрысьціянская Партыя – БНФ* заклікала людзей урачыста адзначыць мэмарыяльнымі мерапрыемствамі Дзень памяці продкаў ***Дзяды***. У Менску арганізавалі шэсьце і мітынг. Людзі пачалі зьбірацца каля Гадзіньнікавага завода ад $11^{00}$. Настрой быў урачысты і прыўзьняты. Сабралося больш за 3 тысячы асобаў. Былі і маладыя людзі, і пажылыя, ішлі былыя вязьні ГУЛАГу.

Людзі ішлі пад *Бел-Чырвона-Белымі сьцягамі*, несьлі сьвечкі і кветкі, вялікія драўляныя крыжы. Гучаў звон, урачыста несьлі абраз ***„Божай Маці Курапацкай усіх бязьвінна расстраляных"***, намаляваны вядомым беларускім мастаком ***Аляксеям Марачкіным***.

Шэсьце праходзіла пад транспарантамі ***„Курапаты – Сьвятыня беларускага народу"***, ***„Не дапусьцім паўтарэньня расейскага тэрору"***, ***„Не забудзем ахвяраў расейскага тэрору"***. Людзі далучаліся да шэсьця на працягу ўсяго 8-кілёмэтровага маршруту. А $15^{00}$ шэсьце дасягнула Курапатаў. Дэманстранты, сьпяваючы гімн ***„Магутны Божа"***, прайшлі з запаленымі сьвечкамі па *Алеі Крыжоў* і сабраліся вакол трох Крыжоў на *Кальварыйскім пагорку Курапатаў*.

Той, хто ня быў у Курапатах ад часу леташніх Дзядоў, быў глыбака ўражаны тым, як перамянілася ўрочышча за год. Паўстаў ***Народны Мэмарыял***, сотні крыжоў узьняліся на магілах пакутнікаў. *Сябры Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі – БНФ* увесь год абаранялі сьвятыню, пацярпелі ад рэпрэсіяў сатанінскай улады. Але ні бульдозеры, ні ОМОН, ні хлусьлівыя СМІ ня здолелі спыніць стваральнай працы нашых сяброў.

Людзі заслухалі зварот *Зянона Пазьняка, Старшыні Беларускага Народнага Фронту „Адраджэньне" і Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі – БНФ*, чалавека, які адкрыў праўду пра Курапацкую трагедыю. Зянон Пазьняк напісаў і пра мінуўшчыну, і пра наша цяперашняе жыцьцё: *„Мінула 13 гадоў з таго часу як мы паставілі перад уваходам на могілкі Курапацкі Крыж Пакуты. Цяпер тут Народны Мэмарыял, сотні крыжоў сьведчаць пра нашу памяць, пра беларускую трагедыю і перажыты час. Цяпер, аднак, вярнуліся ненадоўга горшыя часы. Да ўлады ў Беларусі прыйшлі нашчадкі НКВД, пасьлядоўнікі тых, хто забіваў у Курапатах. Ворагі і здраднікі Беларусі любымі спосабамі імкнуцца затаптаць сьляды злачынства, зьнішчыць, спрафанаваць памяць пра генацыд, зьмяніць ацэнкі, ашукаць грамадзтва і навязаць яму свае тлумачэньні страшных падзей. Але гэта ім ня ўдасца, нягледзячы на абсалютную ўладу і дзейнасьць паслужлівых халуёў. Курапаты – месца расстрэлаў сотняў тысячаў людзей, сымвал вынішчэньня беларусаў расейска-камуністычным рэжымам. Гэта сымвал загубленых жыцьцяў, які мае сусьветны сэнс. Тут не змываецца кроў са злачынных рук. І дарэмныя спробы тых, хто гэта хоча зрабіць. Кроў нявінных сьцеражоная Богам. Памятайма ж нашых Дзядоў і беражэм Курапаты!*

*Мяркую, шмат хто пераканаўся апошнім часам , як Боская воля ў зьберажэньні Курапатаў увасабляецца праз людзей, праз тых беларусаў, якія на плячах нясуць сюды Крыжы Памяці. Гэты народны чын мацнейшы за ўсе напругі маніпулятараў і фальшывых мэмарыялізатараў. Гэтак як паўстаюць Курапаты ў Мэмарыяле Крыжоў, гэтак абудзіцца і наша Беларусь".*

З. Пазьняк шчыра падзякваў мастаку *Аляксею Марачкіну* за створаны абраз ***Божай Маці***. Выступілі таксама сп. ***Юры Беленькі***, выконваючы абавязкі ў Беларусі старшыні Беларускага Народнага Фронту „Адраджэньне" і Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі – БНФ, і намесьнік старшыні Фронту і Партыі сп. ***Сяргей Папкоў***. Яны гаварылі пра цудатворную сілу чалавечай і народнай памяці, здольнай супрацьстаяць злу і гвалту, пра тое, што нашыя ахвяры нагадваюць нам пра небясьпеку новай расейскай акупацыі і паўтарэньня расейскага тэрору. Нагадалі, што нядаўнія трагічныя падзеі ў Маскве, дзе КГБ па загаду Пуціна забіў і скалечыў сотні людзей, сьведчаць пра тое, што сутнасьць расейскай імпэрыі засталася такой жа, як і ў 1930-40-я гады, калі расейскія акупанты тварылі генацыд беларускага народа. Таму наш народ будзе абараняць незалежнасьць нашай краіны ад расейскай агрэсіі.

Выступіў таксама *сп.* ***Эрнст Сабіла***, сьвятар Беларускай эвангельскай царквы (14 гадоў ён пакутваў у ГУЛАГу за вернасьць беларушчыне). Ён казаў пра сатанінскую сутнасьць цяперашняй улады, пра небясьпеку, якая навісла над Беларусьсю з боку агрэсіўнай Расеі.

*Сьвятар* ***Беларускай Аўтакефальнай Праваслаўнай Царквы*** *айцец* ***Леанід Акаловіч*** сатварыў малітву за нявінных ахвяраў Курапацкай трагедыі і за ўвесь беларускі народ, потым асьвяціў крыжы, прынесеныя людзьмі.

Крыжаўзьдзвіжаньнем, сьпевам рэлігійных гімнаў скончыліся мэмарыяльныя мерапрыемствы ў Курапатах. У прыцемках ярка зіхацелі сотні агеньчыкаў зьнічаў, усталяваных людзьмі на магілах і каля крыжоў. Пазьней стала вядома, што ў глыбіні лесу стаяла некалькі вялікіх машын, поўных дзецюкоў з ОМОНа. Антыбеларускія ўлады баяліся мірнага хрысьціянскага шэсьця, і ў гэты дзень абставілі сябе ўзброенымі карніцкімі сіламі.

*3-га лістапада* сябры *Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі – БНФ* прыйшлі да помніка Якубу Коласу ў Менску, каб адзначыць паэтычным чытаньнем *120-я ўгодкі з дня нараджэньня Вялікага Песьняра Беларусі*. Радаснай была сустрэча з нашчадкамі Якуба Коласа, сынам, унукамі і праўнукамі, якія таксама прыйшлі да помніка. Міліцэйскі палкоўнік у атачэньні чыноў ва ўніформах і цывільным папярэдзіў, што на плошчы Якуба Коласа вершы чытаць нельга, а „чуть что, то будут задержанія". Агентура актыўна здымала на відэакамэры нашых людзей з кветкамі і кнігамі ў руках. ***Сын Коласа Міхась*** падзякваў людзям за памяць і любоў да творчасьці Песьняра. Людзі ўсклалі да помніка кветкі і прасьпявалі гімн ***„Магутны Божа"***.

*3 лістапада* каля 300 сяброў *Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі – БНФ* прайшлі урачыстым шэсьцем ад палаца камвольнага камбіната ў Менску ва ўрочышча ***Лошыцкі Яр***. Ішлі пад *Бел-Чырвона-Белымі сьцягамі*, несьлі транспаранты ***„Не дапусьцім паўтарэньня расейскага тэрору"***, ***„Вечная памяць бязьвінным ахвярам беларускага народу!"***.

Каля Крыжа на магілах ахвяраў расейска-бальшавіцкага тэрору 1930-х гадоў адбыўся мэмарыяльны мітынг. Выступілі сябры кіраўніцтва Фронту і Партыі спадары ***Юры Беленькі*** і ***Сяргей Папкоў***, ***Мікола Суслаў***, ***Мікола Капарыха***. Яны гаварылі пра народную памяць і сапраўдныя народныя помнікі, створаныя самымі людзьмі, пра неабходнасьць бараніць Бацькаўшчыну ад расейскай агрэсіі. Людзі ўсклалі да Крыжа кветкі, сьпявалі рэлігійныя гімны.

*2-3 лістапада* сябры Фронту і Партыі правялі мэмарыяльныя мерапрыемствы Дня памяці продкаў Дзяды па ўсёй краіне.

***(Інфармацыйная камісія Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі – БНФ. В. БУЙВАЛ)***

## БЕЛАРУСЫ Ў АБАРОНУ ЗАКАЕВА

31 студзеня ў Лёндане мусіў быў пачацца судовы працэс над ***Ахмэдам Закаевым***, афіцыйным прадстаўніком ***Прэзыдэнта Чачэнскае Рэспублікі Ічкерыя Аслана Масхадава***. Расея патрабуе ад ангельцаў выдаць Закаева, каб забіць, піша ўсялякія фальшывыя „ноты" і абгрунтаваньні.

Зьвяз Беларусаў Замежжа ў Вялікабрытаніі выступіў з адкрытым лістом прэм'ер-міністру Тоні Блэру ў абарону Ахмэда Закаева.

„Абвінавачваньні, выстаўленыя расейскім бокам, не адпавядаюць сапраўднасьці, — пішуць брытанскія беларусы. — Гэта ёсьць спроба палітычнай расправы...Чачэнцы ня хочуць вайны, яны гатовыя спыніць баявыя дзеяньні без якіх бы там было ўмоваў, калі гэтаксама зробіць Расея...

Учыняецца генацыд чачэнскага народу. Таму мы, Зьвяз Беларусаў Замежжа, рашуча падтрымліваем змаганьне чачэнскага народа за права на існаваньне й выступаем у падтрымку Ахмэда Закаева, імкненьня спыніць ваенны канфлікт у Чачэніі й пачаць мірныя перамовы."

## 120-Я ЎГОДКІ

2002 год праходзіць пад знакам 120-гадовага юбілею волатаў беларускай літаратуры ***Янкі Купалы*** і ***Якуба Коласа***. Акупацыйныя ўлады рэжыму, як і трэба было чакаць, ігнаруюць гэтыя вялікія даты. Але за справу ўзялася адраджэнцкая грамадзкасьць.

*Кансэрватыўна-Хрысьціянская Партыя — Беларускі Народны Фронт*

ужо некалькі месяцаў кожны чацьвер рэгулярна ладзіць спэцыяльныя паэтычныя купалаўскія і коласаўскія чытаньні і выступы ў парку Янкі Купалы і на плошчы Якуба Коласа. Імпрэзы адбываюцца ў рамках асьветніцкай фронтаўскай праграмы ***„Беларуская Салідарнасьць”***.

7 ліпеня фронтаўцы з удзелам грамадзкасьці арганізавалі вялікі мітынг (некалькі тысячаў асобаў), чытаньні і канцэрт у парку Янкі Купалы ў Менску. Сьвята доўжылася больш за тры гадзіны і сталася ўрачыстым завяршэньнем штотыднёвых літаратурных Купалаўскіх чытаньняў. Урачыстасьць закончылася агульным сьпяваньнем ***„Пагоні”***.

Тым часам Коласаўскія чытаньні і выступы, прысьвечаныя Купалу, Коласу, Багдановічу, працягваюцца. Шмат клопату, таленту і працы (а ў цяперашніх неспрыяльных варунках — і адвагі, бо былі арышты) прыклалі ў гэтай справе кандыдат навук *спадарыня* ***Валянціна Мароз***, Выконваючы абавязкі старшыні БНФ ***Юры Беленькі***, мастацтвазнаўца і сакратар Управы БНФ ***Валеры Буйвал***, сябра Сойму БНФ ***Анатоль Крываротт***, дзясяткі іншых фронтаўцаў і клапатліўцаў беларускай культуры.

Да 120-годдзя *Якуба Коласа* ў выдавецтве Беларускага Фонду культуры выйшла паэма ***„Новая Зямля”*** на беларускай, польскай і расейскай мовах. Поўны польскі пераклад (які цалкам выдадзены ўпершыню) зрабіў ***Чэслаў Сэнюх***, імя якога добра ведамае ў Польшчы і асабліва на Беларусі.

У асобе спадара Чэслава Сэнюха беларуская літаратура мае ня толькі выдатнага перакладчыка і папулярызатара яе ў Польшчы, але і гарачага прыхільніка беларускага прыгожага пісьменства.

***Чэслаў Сэнюх*** нарадзіўся на Наваградчыне і ў Польшчу прыехаў пасьля вайны. Пераклаў шмат твораў беларускіх клясікаў. Праца над перакладам „*Новай Зямлі”* доўжылася 10 гадоў. У ліпені па радыё прагучэла зьместоўнае інтэрв'ю перакладчыка пра асаблівасьці перакладаў „Новай Зямлі”.

„Перакласьці поўнасьцю „Новую Зямлю” на расейскую мову ня ўзяўся ніводны з расейскіх перакладчыкаў, — кажа спадар Чэслаў Сэнюх. — Расейскі пераклад складаецца з кавалкаў, перакладзеных пяцьцю перакладчыкамі. Расейскія перакладчыкі ўвесь час значна скарачалі і скажалі зьмест паэмы. Аб'ём перакладаў „Новай Зямлі” не супадае з аб'ёмам беларускага арыгінала. Гэта заўважыў рэдактар выданьня на трох мовах ***Язэп Янушкевіч***. Аказалася, — адзначае спадар Чэслаў Сэнюх, — што расейскі пераклад карацейшы за арыгінал на тысячу (!) радкоў. (Арыгінал налічвае 10900 зь лішнім радкоў).

Перакладчыкі, пэўна, атрымалі загад, — мяркуе спадар Чэслаў. — Яны баяліся, як агню, тых мейсцаў, дзе гаворка йдзе пра гаспадарнасьць, працавітасьць, заможнасьць беларускага селяніна таго часу. Ім трэба было, каб ён аказаўся ў гэтай паэме голы, як сьвяты турэцкі, каб ён спадзяваўся адно толькі на дапамогу (як яны сябе называюць) „старэйшага брата”, расейца „освободителя”. Таму яны, напрыклад, заядла змагаліся з гэтай праблемай і пляжылі апісаньні ўсіх коласаўскіх сьвяточных сталоў: калядны стол, коласаўскі Вялокодны стол, стол падчас агляду пчол і г. д. Прыклад — Вялікодны стол. У рускім перакладзе — апісаньня стала проста няма. У параўнаньні з арыгіналам — гэта хлусьня, няпраўда.

Якуб Колас апісваў сьвята ў сваёй хаце. Ён гэтага не прыдумаў, а браў, як было. Ці, напрыклад, Колас апісвае, як дзецям на Вялікадня за сталом далі пакаштаваць алькаголь — „малым паспрабаваць далі”. Рускі фальсіфікат у перакладзе гучыць так: „И им по маленькой налили”. Тут розьніца ў сэнсе, і не малая.

У Расеі тады быў голад, там была бяда. Перакладчыкі стараліся, каб расейскі селянін ня чуў, што недзе ў Беларусі людзі добра жывуць, на сталах усё ёсьць, як ня сьнілася ніводнаму расейцу.

Польскі пераклад даўжэйшы за арыгінал на паўтары сотні радкоў. Атрымалася так, галоўным чынам, з-за спэцэфічнасьці польскай мовы. У пальшчызьне націск у словах стала падае на перадапошнім складзе. Таму рыфмы ў польскай мове пераважна жаночыя. У той час у беларускай мове — націск перасоўны, ёсьць шмат слоў з націскам на апошні склад. Таму і мужчынскіх рыфмаў — колькі хочаш. І мова больш эластычная, больш гнуткая. Гэта вельмі важна ў вершы. Пры меншай колькасьці слоў можна выказаць значна больш складаны зьмест.”



Фота З. Пазьняка

***Чэслаў Сэнюх (зправа) і Сакрат Яновіч. Беласточчына, 2001 г.***

Коласаўскія і Багдановічаўскія чытаньні прадаўжаюцца, а Купалаўскія імпрэзы завершаныя. Апошняя купалаўская ўрачыстасьць адбылася 8-га ліпеня ў Барысаве. Мясцовыя ўлады не пажадалі адзначыць 120-я ўгодкі Янкі Купалы. Але адбыўся грамадзкі мітынг. Арганізавала мітынг ***Алеся Ясюк*** *(„Народная Грамада”)*. У ім узялі ўдзел усе прадстаўнікі партыяў, рухаў і беспартыйныя. Мітынг адбываўся пад *Бел-Чырвона-Белымі сьцягамі*. Міліцыі не было.

***(Інфа)***

## ІХНЫЯ НОРАВЫ

У жніўні на канфэрэнцыю ў Беласток ехаў у Польшчу пісьменьнік ***Лявон Важко*** і вёз з сабой 10 асобнікаў сваёй навуковай кніжкі „Гістарызм сьвядомасьці”, выдадзенай у Менску ў выдавецтве „Мастацкая літаратура”. Вёз таксама 50 асобнікаў свайго артыкула, надрукаванага ў газэце „Дзея часу”.

На беларускай мяжы лукашысцкія мытнікі сканфіскавалі ягоныя кніжкі і газэты, як падазроныя. Паабяцалі, што потым вернуць кніжкі, „калі яны не нанесьлі шкоды дзяржаве”.

***(Інфа)***

## САБАЧАЯ ЭМАНСІПАЦЫЯ

Нават у цэнтры Парыжа немагчыма ступіць, каб ня трапіць у сабачыя экскрэмэнты. Тое ж самае ў Варшаве. „Сабачая паталёгія” распаўсюджваецца па Эўропе на Ўсход і ў бакі, як эпідэмія і, як мне здаецца, з проста прапарцыйнай залежнасьцю ад згоршаньня людзей.

Чым больш злых людзей, тым больш паталягічнага замілаваньня да сабак, якія гадзяць, дзе трапіцца, а ў Варшаве яшчэ й кусаюць ды загрызаюць дзяцей, і нават сталых асобаў.

У беднай Усходняй Эўропе сабачнікі імкнуцца чамусьці ўдаваць з сябе багатых людзей і любяць сваю псіну больш за чалавека. „Но странною любовью”, — як пісаў адзін расейскі паэт. Калі сабака надакучыць ці стане непатрэбным, яго выкідаюць на вуліцу, як старую

рэч, нягледзячы на нядаўнюю гарачую дэманстрацыю прыватна-ўласьніцкага закаханьня.

* * *

У працэсе разьвіцьця чалавечай цывілізацыі людзі выпрацавалі здаровыя дачыненьні да свойскай жывёлы, якая жыве побач з чалавекам. Найбольш разумныя адносіны да жывёлы — у сялянаў. Трактаваньне жывёлы тут абумоўлена прагматычным інтарэсам, патрэбамі чалавека, зыходзіць зь веданьня яе біялёгіі, псіхалёгіі дастасаваньня і належнага выкарыстаньня зь неабходным забесьпячэньнем умоваў утрыманьня і размнажэньня. Адносіны да жывёлы мераюцца разумнымі правіламі.

Калі ж ва ўтрыманьні жывёлы няма прагматычнай патрэбы, то чалавек яе і не трымае. Бо гэта зьвязана з коштамі, нялёгкай працай і абавязкамі.

Непрагматычнае (не вынікаючае з патрэбы) утрыманьне свойскай жывёлы абумоўнена, як правіла, замілаваньнем да яе, якое часта можа перарастаць у паталёгію. Бо чалавек, які трымае жывую істоту для задавальненьня свайго замілаваньня, канцэнтруецца на гэтым сваім замілаваньні, пачынае абчалавечваць жывёлу, прыпісваць і навязваць ёй свае пачуцьці і паняцьці,ператвараць у паслушную жывую цацку, забаўку, аб'ект пакоры і кіраваньня, выяўляць на ёй свае нерэалізаваныя сярод людзей псіхалягічныя комплексы і г.д. Нематываваная злосьць і пэрманэнтная няўжыўчывасьць самазакаханай асобы, якая лічыць сябе ўсімі пакрыўджанай, можа выяўляцца ў яе ўспышкамі паталягічнага замілаваньня да свайго сабачкі (ці ката), які адзіны ёй верны, ласкавы і г.д.

Паталёгіі ненармальнай, неадэкватнай прыхільнасьці да жывёлаў існавалі заўсёды, хоць і не былі правілам. Назіраючы цяперашні сьвет зь ягонай збочанасьцю каштоўнасьцяў у бок матэр'яльных мэтаў, камфорту, дасягненьня посьпеху і задавальтненьня нізкіх патрэбаў, заўважаем паўсюднае ўзрастаньне моды на сабак, рост неадэкватных паводзінаў, агрэсіўных комплексаў, якія распухаюць, як лавіна, становяцца сацыяльна-грамадзкай праблемай.

* * *

Паталягічная любоў да сабачак (асабліва ўсялякіх там анахарэтаў) вельмі часта сьведчыць пра збачэнскую нянавісьць да людзей і да ўсяго сьвету.

Асабліва цьвёрдым у „прыхільнасьці" да жывёлы быў савецкі ўласьнік сабача-кацячай душы. Некалі я здымаў кватэру ў Менску ў кааператыўным доме, дзе жыло шмат расейскіх ваенных. Прапаршчык N. меў вучонага галуба, а ягоны сусед — прапаршчык M. — пародзістага ката.

Бывала выйдзе прапар N. на двор: плясь-плясь у ладкі, а вучоны галуб ужо з балькону яму на плячо зьлятае. Проста на пагон. Сядзе і сядзіць сабе гэтак.

Любоў да жывёлак (да „братьев наших меньших") зрабіла прапараў сябрамі. Дружылі сем'ямі. Але трэба ж „беде случиться". Аднойчы кот прапаршчыка M. зьеў галуба прапаршчыка N. Маркота была вялікая. Толькі праз нейкі час зьнік кот, і па пад'езьдзе паплыў пах смаленага. Прапар M. злавіў ката-абжору, прывязаў дротам за шыю і за хвост, а канцы — у разетку, 220 вольт. Так і сканаў няшчасны Васька. Прытым, да задавальненьня экзэкутара, крычаў, як сірэна паветранай трывогі (прапар служыў у авіяцыі).

Другі аматар жывёлы выяўляў схільнасьці сабачага дрэсіроўшчыка. Выйдзе на двор і ўсё: „Ка мне! Ка мне! Ка мне! Каму сказал, ка мне, падла! І як перацягне рамушком па вушах, аж заякоча бедалага.

Але ведама, бескульр'е. Сапраўдныя багацеі і культурныя людзі на Захадзе гэтак па-хамску з жучкай не абыходзяцца. Тут сабакі маюць свае законныя правы і арганізаваных абаронцаў сабачых правоў. Тут цыгарэтай цюцьку ў нас ня тыкай — загрыміш на 25 год (а то і пажыцьцёва). Тут вас, варвараў, навучаць гуманізму (дакладней — сабачызму). А калі іншая здыхата акалее (прабачце — памрэ) з-за старасьці ці ад падагры, то — калі ласка, з музыкай і пад літаўры на лепшыя сабачыя могілкі за якіх-небудзь сто тысячаў даляраў і пад скульптурным помнікам з чорнага лабрадора.

У лістападзе ў ньюёрскіх газэтах напісалі пра „добрую" Джэніфэр Лёпэз, якая „вельмі хораша клапоціцца пра сваіх любімцаў". Яна забраніравала для сваіх сабачак месцы ў спэцыяльным сабачым гатэлю. Кожны раз, калі добрая Джэніфэр вельмі занятая ў Нью-Ёрку, яе сабачкі абслугоўваюцца гэтак жа хораша, як і яна сама.

Яе замілаванцы пароды кокер-спаніэль і коргі застаюцца ў прэзідэнцкім нумары гатэлю Ritzy Canine Carriage House, цана якога 262 даляры за ноч (за аднаго цюцьку, вядома).

Распешчаныя сабачкі жывуць у нумары, дзе ёсьць тэлевізар, відэамагнітафон, відэабібліятэка і пасьцель з тонкага кашэміру. І калі яны адчуваюць, што выглядаюць ня вельмі прывабна, то могуць наведаць салён прыгажосьці.

Лёпэз любіць дагаджаць сваім сабачкам. Апошнім часам яна была са сваімі любімцамі ў Нью-Ёрку. Там клапатлівая гаспадыня купіла сваім кудлатым дзеткам крышталёвыя нашыйнікі за 225 даляраў кожны.

От так жывецца ў цывілізаваных краінах, дзе па-сапраўднаму спасьцерагаюцца правы сабакі.

Як сказала адна мадам у варшаўскім радыё: „Сабачкі такія верныя і такія ўдзячныя, такія ўдзячныя, ня тое, што людзі".

*сьнежань 2002 г.* ***Адам МІКША***

# ПРЭС-РЭЛІЗ

*(паводле „Народнай Волі", „Нашай Свабоды" і радыё.)*

## *СТУДЗЕНЬ (2002 г.; працяг з №6(46))*

■ Студзеньскі візыт прэзыдэнта Расеі Пуціна ў Польшчу кожнаму, хто трошкі знаёмы з антычнай гісторыяй, нагадаў пра трыюмф імпэратара Нэрона ў Грэцыі. Хітрыя эліны ў кожным горадзе засыпалі сумнавядомага рымскага злодзея, тлустага і безгалосага, алімпійскімі вянкамі за спартыўныя і сьпеўныя рэкорды. Сьмешна было глядзець, як варшаўскі эстэблішмэнт выконвае камарыныя скокі каля банальнага афіцэра ГБ з непрыемным тварам. Смутна было глядзець камунікаты навінаў польскай тэлевізіі, калі на экране паліцыя таўкла дэманстрантаў, што віталі маскоўскага госьця крыкамі „Забойца!" Цікава было паслухаць у тыя ж дні па радыё, як нядаўні крамлёўскі чыноўнік і магнат Беразоўскі з Лёндану абяцаецца абнародваць дакументы, што сьведчаць пра арганізацыю ўзрываў жылых дамоў і забойстваў людзей у Маскве ў 1999 г. рукамі КГБ і Пуціна. А тым часам Пуцін заяўляе ў Варшаве: „... расейска-польскую мяжу ў абодва бакі штогод перасякаюць мільёны людзей". Гэта ён робіць выгляд, што Беларусі ўжо для яго не існуе.

А вось „разным прочім шведам" менскія ўлады нагадалі і не раз, што такая тэрыторыя і мяжа існуе. Кіраўнікі ўсіх парляманцкіх партыяў Швэцыі выступілі з адкрытым лістом, у якім заклікалі ўлады Беларусі зьмяніць візавую палітыку. У лісьце гаворыцца, што „без задавальняючага тлумачэньня, шэрагу грамадзянаў Швэцыі і іншых краінаў было адмоўлена ва ўезьдзе ў Беларусь. Некаторыя зь іх нават былі вымушаныя вяртацца зь менскага аэрапорту, нягледзячы на тое, што іхныя візы былі ў парадку". Знай нашых!

■ ***Курапацкая сьвятыня*** спазнала ўжо не адзін акт блюзьнерства. Здавалася, што нічога новага нельга вынайсьці ў подлым памкненьні апаганіць памяць ахвяраў. Аднак, сатанінская фантазія ня мае межаў. Дарослыя людзі з недаўменьнем глядзелі на прысутных у Курапатах некаторых юных кругласутачных „абаронцаў". Тыя займаліся толькі сабой, у багаслужбах ня ўдзельнічалі, крыжы ставіць не дапамагалі, наогул нікога і нічога вакол сябе не заўважалі. Некаторыя асобы сярод іх паводзілі сябе нават агрэсіўна і дзіка. Затое СМІ ўслаўлялі „абаронцаў" на ўсе лады – „яны бароняць... яны наша слава і надзея..." Праўда, што тычылася драматычных здымкаў абароны сьвятыні або ўсталяваньня крыжоў, то ў кадры былі ўсё людзі сталыя, у асноўным сябры Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі – БНФ (пра іх у СМІ, звычайна, ані слова, або паўслова).Гэта вельмі

сымптаматычная прыкмета ў паводзінах некаторых журналістаў. Друк зьмяшчаў панэгірыкі 16-ці і 18-гадовым (подзьвіг якіх ў тым, што яны начавалі на ўскрайку ўрочышча), распавядаў, як мужна яны начавалі, як браталіся з амонамі, пусьціўшы іх грэцца ў свой намёт. Але самае цікавае – гэта фінал пераможнага рэпартажу: „Паклон вам, дарагія! Дзякуй вашым бацькам за такіх дзяцей. Вы перамаглі! Праз новую дарогу ў Курапаты ў гэтыя дні самімі будаўнікамі пракладзены шырокі пераход...” *(„Народная Воля”, — 2002, 18.01)*

Дарога, пракладзеная па курапацкіх магілах, трубы і пераходы, якіх не павінна быць на тэрыторыі хрысьціянскіх пахваньняў, услаўляюцца ў стылі камсамольскіх новабудоўляў — як перамога (зноў жа — незразумела, каго над кім). Невядома, чаго ў гэтым больш – глупства або цынізму. Хутчэй за ўсё мае месца і адно і другое.

Невыпадковы характар такога тону і зьместу курапацкага рэпартажу ў *„Нар. Волі”* ( і ў шмат якіх яшчэ іншых так званых „незалежных” СМІ) становіцца больш зразумелым у кантэксьце іншых ініцыятываў „трудящихся”.



Фота Ю. Беленькаг

*Менск-2003. Зімовым халодным днём.*

Літаральна побач з названым артыкулам зьмешчаны камунікат Беларускага Камітэту міру (о-о, мы памятаем гэтую кагэбісцкую арганізацыю!). Дык вось, „барцы за мір у штацкім” выступаюць з ініцыятывай стварэньня ў Курапатах „Мэмарыялу пралітай крыві”. Зразумела, што пра тых, хто праліваў кроў, чыю і калі, „барцы” не зьбіраюцца згадваць. Прапануюць толькі абвесьціць рэспубліканскі конкурс на праект „мэмарыялу” ды рэалізаваць яго хутчэй да 2003 г. Абстрактненькая назва кэгэбісцкага мэмарыялу абяцае нам зноў якую-небудзь „родіну-мать” з чырвонай зоркай. „Барцы”, аднак, і тут не пазьбегнулі цынізму. У заяве ўсяроўна вылезлі гэбоўскія вушы: „Такім чынам будзе закрытая тэма супрацьстаяньня, ***штучна створаная на глебе памяці”***.

■ Міністр архітэктуры і будаўніцтва Генадзь Курачкін паведаміў, што летась у Беларусі колькасьць стратных прадпрыемстваў у будаўніцтве павялічылася больш як удвая: такіх у будаўніцтве налічваецца **24%**, а ў галіне вытворчасьці будматар’ялаў – **47%** (!).

■ *Фальсіфікацыя прадуктаў харчаваньня.* Як паведаміў дырэктар Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтру па экспэртнай ацэнцы якасьці і бясьпекі прадуктаў харчаваньня Валеры Мурох, ацэнка якасьці прадуктаў харчаваньня як айчынных, так і замежных у нашай краіне не праводзіцца. Сёньня ўтрыманьне жывёльных тлушчаў у рацыёне беларуса ў два с паловай разы вышэйшае, чым у рацыёне заходніх эўрапейцаў. У сувязі з гэтым Беларусь на першым месцы ў Эўропе па сардэчна-сасудзістых захворчаньнях.

■ “Гэта агонія ўлады, якая ўжо няздольная разумным шляхам выратаваць эканоміку ад банкруцтва”.—так пракамэнтаваў экс-старшыня Нацбанку Беларусі Станіслаў Багданкевіч пастанову Савету міністраў ад 12 сьнежня 2001 г. „Аб мерах па выплаце заробкаў работнікам галінаў эканомікі”. Гэтай пастановай, якая нідзе не друкавалася і не ўнесеная нават у нацрээстр прававых актаў (!), урад выдаткаваў звыш 100 мільярдаў рублёў стратным галінам народнай гаспадаркі на пагашэньне запазычанасьці па заробках. Сп. Багданкевіч працягвае камэнтар: „Калі крэдыторская запазычанасьць па Беларусі складае звыш 7 трыльёнаў рублёў, калі амаль 3 трыльёны складае пратэрмінаваная запазычанасьць, то такія пастановы не вырашаюць праблемы. Агаліўшы ўсе іншыя плацяжы, улады выдалі крэдытаў больш чым на 100 мільярдаў рублёў на разавую выплату зарплаты. Прычым з найгрубейшымі парушэньнямі заканадаўства: ёсьць банкаўскі кодэкс, дзе чорным па белым запісана, што акцыянэрныя камэрцыйныя банкі цалкам самастойныя, яны не павінны выконваць нейкія прадпісаньні і крэдытаваць стратны сэктар эканомікі. У нас дзьве траціны суб’ектаў гаспадараньня – стратныя, іх нельга крэдытаваць нават па законах планавай эканомікі. Безумоўна, з часам паляціць уніз курс нацыянальнай валюты.”

■ На пачатак гэтага году агульная сума крэдыторскай запазычанасьці прадпрыемстваў сельскай гаспадаркі Магілёўшчыны дасягнула **115** мільярдаў рублёў. Па выніках працы за мінулы год страты панесьлі калі **80%** гаспадарак. У **70%** гаспадарак выплачаны заробак не забясьпечваўся выручкай. Такія лічбы гучалі на нарадзе магілёўскага абласнога кіраўніка Б. Батуры.

А вось па статыстыцы злачынстваў *Магілёўшчына* за 2001 г. заняла першае месца ў краіне. Летась на 100 тысячаў жыхароў вобласьці прыпала **107** злачынстваў, тады як у сярэднім па краіне – **84**.

■ Паводле афіцыйнай статыстыкі, у Расеі мільён беспрытульных дзяцей. Вулічныя дзеці сьпяць на вакзалах, а ўдзень жабруюць, прадаюць наркотыкі, чыняць крадзяжы. **90%** зь іх маюць бацькоў. Але яны ўцяклі з сям’і і не зьбіраюцца туды вяртацца. Сям’я ў Расеі разваленая алькагалізмам і гвалтам. Выручаныя грошы дзеці выдаткоўваюць на дыскі, „нюхальны” клей ды ежу. Большую частку аддаюць верхаводу, як правіла падлетку, які бароніць іх ад іншых кланаў і дазваляе ім спаць на пэўным вакзале. У Маскве іх – **50** тысячаў. Здароўе бальшыні дзяцей падарванае, яны церпяць на хранічныя захворваньні.

■ Прэса час ад часу паведамляе пра ахвяры сярод шукальнікаў доўгага рубля на прасторах „брацкай” Расеі. Найбольш актыўныя шукальнікі з Магілёўшчыны, тым больш, што мясцовыя ўлады на афіцыйным узроўні афармляюць ім камандзіроўкі ў расейскае „Эльдарада”. Магілёўскія рабочыя ***В. Дыль***, ***Ул. Балыка***, ***А. Рабзевіч*** і ***А. Жыжка*** судзяцца з уладамі. Яны патрабуюць выплаты зробленых у Расеі грошай хаця б у памеры ня менш за сярэднямесячны заробак у Беларусі і камандзіровачных. Пад Масквой яны працавалі на рэканструкцыі ваенных казармаў. Акрамя пляката „Крепи обороноспособность России!” над галавой, ім абяцалі бясплатнае жыльлё, медабслугоўваньне ды 300 даляраў штомесяц.

Жыць давялося ў тых жа казармах разам з пацукамі, а есьці кансэрвы. Накрываліся коўдрамі, ад якіх потым сьвярбела ўсё цела. Працавалі з крымінальнікамі. Адзін з рабочых, 42-гадовы ***Уладзімер Рослаўцаў***, памёр ад сардэчнай і лёгачнай недастатковасьці. „Хуткая” прыехала надта позна.

У канцы ўсім раздалі па 40-100 доляраў. Суды працягваюцца...

***Валеры БУЙВАЛ***

Беларускія Ведамасьці
Беларускае выданьне
У супрацоўніцтве зь Беларускім Выдавецкім Таварыствам ў Амэрыцы
**Рэдакцыя: Зянон Пазьняк, Галіна Палачаніна**
**Адрас рэдакцыі: 02-017 Warszawa, Al. Jerozolimskie 125/127**
**тэл./факс: (+48 22) 628 76 73**